Нотны радок

# МАНЮШКА Ў СЭРЦАХ, МАНЮШКА Ў ГІСТОРЫІ

**Гэты год праходзіць пад знакам вялікага кампазітара Станіслава Манюшкі. Бо менавіта цяпер адзначаецца 200-годдзе з дня яго нараджэння — праходзяць шматлікія канцэрты, навуковыя канферэнцыі, адкрыцці памятных знакаў і многае іншае. Манюшка ў сэрцах, Манюшка ў гісторыі, яго музыка — на сцэнах. У пасольстве Літвы ў Беларусі адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная гэтаму творцу, а ў мінскім касцёле Найсвяцейшай Тройцы адбыўся сумесны канцэрт беларускіх і літоўскіх музыкаў, на якім выканалі духоўныя творы кампазітара.**



**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літвы ў Беларусі Андрус ПУЛОКАС** падзяліўся даволі прыватнымі эмоцыямі, якія звязваюць яго з кампазітарам:

— Апошнім часам ладзіцца нямала ініцыятыў, прысвечаных тым дзеячам культуры, якія нас аб'ядноўваюць. Іх творчасць радуе ўсіх. Я падумаў: «А якія ў мяне адносіны са Станіславам Манюшкам?..» Бо ў кожнага з нас абсалютна рознае стаўленне да славутых людзей. Я зразумеў, што маё дачыненне з кампазітарам адбываецца дзякуючы помнікам. Адразу прыгадваецца наш цудоўны Вільнюс, стары горад. Там, у вельмі ўтульным месцы, стаіць помнік — колькі сябе памятаю, ён быў заўсёды. Даволі стары, зроблены з цёмнага каменю. Аказалася, што гэта самы стары помнік Станіславу Манюшку, усталяваны яшчэ ў 1922 годзе. Пастамент для яго выкарысталы ад помніка Пушкіна. (Да 1914 года ў Вільнюсе быў помнік гэтаму паэту, але з нейкай прычыны ён быў вывезены ў Расію, затое застаўся пастамент.) Гэты год у Вільнюсе быў аб'яўлены годам Манюшкі — бо значная частка жыцця кампазітара звязана з літоўскай сталіцай. І хоць на той стары помнік звычай не надта звяртаюць увагу, не так даўно я быў каля яго і пабачыў некалькі пакладзеных кветак... Значыць, людзі памятаюць, і гэта прыемна.

**Прафесар Віктар СКАРАБАГАТАЎ** адзначыў, што трэба, каб кожнаму слыннаму ўраджэнцу краіны быў пастаўлены помнік там, дзе ён нарадзіўся ці дзе зрабіў значны ўнёсак у яе культуру, — і тады свядомасць народа абсалютна зменіцца. А тое, што ў беларускай сталіцы нарэшце з'явіўся помнік Манюшку, перакананы прафесар, цалкам змяніла стаўленне ў музычным асяроддзі да кампазітара, яго творчасць пачалі ўспрымаць як уласную спадчыну і шырэй уводзіць у музычны ўжытак.

— У часы Манюшкі за друкаванае беларускае слова маглі пасадзіць у турму назаўтра ж — гісторыя літаратуры, культуры гэта ведае, — дадае Скарабагатаў. — Менавіта ў такіх умовах ставілася першая опера на беларускай мове «Ідылія» («Сялянка»). Натуральна ж, адразу ў дзень абвесткі спектакль забаранілі, афішы сталі здымаць. Аднак прэм'ера ўсё ж такі адбылася, і яшчэ ў пяці гарадах таксама. Уявім сабе Манюшку, які пісаў музыку да беларускамоўнага тэксту Дуніна-Марцінкевіча, — ён што, бессвядома гэта рабіў? Ён рабіў тое абсалютна свядома. Яму Радзіма была важнейшая, чым небяспека трапіць за краты, дзе пабывалі многія іншыя дзеячы.

**Кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Вольга САВІЦКАЯ** нагадала, што асоба Станіслава Манюшкі ў час святкавання яго 200-годдзя з'яўляецца тым сімвалам, які аб'ядноўвае творчую прастору Беларусі, Літвы і Польшчы. Нарадзіўся будучы кампазітар на Міншчыне, у маёнтку Убель, дзе назапашваўся атмасферай яркага, непаўторнага мясцовага фальклору. Станіслаў вучыўся ў Мінскай мужчынскай гімназіі і музычнай школе Дамініка Стафановіча — у гэты час пазнаёміўся і пасябраваў з многімі маладымі літаратарамі, артыстамі, музыкамі. Пакідаючы Мінск, 17-гадовы Станіслаў Манюшка ўжо цвёрда ўсведамляў сваё кампазітарскае пакліканне.

— У Мінску на гарадской сцэне ў 1834 годзе прагучала музыка Манюшкі да спектакля «Канторскія служачыя», а ў 1843 годзе — да спектакля «Латарэя», — дадае Вольга Савіцкая. — Творчае супрацоўніцтва звязала кампазітара з пачынальнікам новай беларускай літаратуры і беларускага тэатра Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам. На яго словы створаны спектаклі «Рэкруцкі набор», «Спаборніцтва музыкаў», «Чароўная вада». У 1852 годзе ў памяшканні мінскага тэатра з вялікім поспехам прайшла пастаноўка «Ідыліі» («Сялянкі»), дзе ўпершыню загучала беларуская мова.

Да завяршэння «Года Манюшкі» застаецца ўсяго пару месяцаў. Аднак па-сапраўднаму адкрыць для сябе яго творчасць, пачуць і ўбачыць на розных пляцоўках — ад вялікага тэатра оперы і балета да невялічкіх цэркваў і касцёлаў — ніколі не будзе позна.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# Рассакрэчанае: пра ўз'яднанне Беларусі

**Адну з найважнейшых у нашай гісторыі падзей — уз'яднанне Беларусі 17 верасня 1939 года — Нацыянальная бібліятэка прапануе пазнаць праз архіўныя дакументы, фотаздымкі, перадавыя артыкулы газет, паэзію і графіку. Набыткі з фондаў бібліятэкі, Нацыянальнага архіва Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў аб'ядналіся пад ёмістымі радкамі з верша Янкі Купалы «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі» ў галерэі «Атрыум».**

Выстаўка адкрылася ў дзень 80-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. «У партнёрстве з іншымі ўстановамі, што захоўваюць нашу нацыянальную памяць, мы змаглі не толькі паказаць факты і падзеі, што адбываліся на Беларусі ў гэты час, але і перадаць настрой, які панаваў сярод беларускай інтэлігенцыі ў сувязі з узнаўленнем тэрыторыі нашай краіны», — каментуе **першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алена ДАЎГАПОЛАВА.**

«К вам ідзе непабедзімая Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, каб назаўсёды пазбавіць вас ад кабалы паноў, памешчыкаў і капіталістаў, — гаворыцца ў прадстаўленай у экспазіцыі адозве камандуючага Беларускім фронтам Міхаіла Кавалёва, — каб выратаваць вас і вашы сем'і ад пагрозы знішчэння з боку врагоў беларускага народа».

Па экспанатах можна ўбачыць, як Заходняя Беларусь станавілася савецкай — праз вітанне Чырвонай Арміі, стварэнне абласных выканаўчых камітэтаў, нарады старшынь сялянскіх камітэтаў, выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі, мітынгі і так далей. У пастанове Саўнаркама БССР і Цэнтральнага камітэта КП(б)Б пішацца аб адсяленні жыхароў з пагранічнай паласы і ачыстцы яе ад пабудоў, а таксама аб адвядзенні адселеным жыхарам участкаў і надзелаў зямлі.

У тэлеграме Іосіфу Сталіну, дзе паведамляецца аб стане спраў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, між іншым расказваецца, што ў кожным горадзе створаны часовыя ўпраўленні, куды штодня прыходзяць з пытаннямі аб тым, што рабіць з маёмасцю памешчыкаў ці хлебам, забраным палякамі на патрэбы арміі. «Многіх асаднікаў і памешчыкаў сяляне знішчаюць (вешаюць, расстрэльваюць, забіваюць)», — дакладваецца Сталіну.

Не менш паказальнай у кантэксце стаўлення да падзей з'яўляецца частка выстаўкі, што ўключае ў сябе старонкі газет «Звязда» і «Советская Белоруссия». «Працоўныя Заходняй Беларусі аднадушна выказваюцца за ўстанаўленне савецкай улады і далучэнне да Савецкай Беларусі», — паведамляе «Звязда» на першай паласе і піша пра «небывалы энтузіязм», з якім сустракаюць зварот аб скліканні Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, і «адзіную ўладу, што клапоціцца аб інтарэсах народа, — савецкую».

Дапаўняюць выстаўку фотаздымкі, дзе паказваецца, як жыхары сустракаюць воінаў Чырвонай Арміі ці мітынгуюць з расцяжкай «Няхай жыве аб'яднаная Савецкая Беларусь», альбо пісьмовы зварот жыхаркі Мінска да сакратара ЦК КП(б)Б з просьбай накіраваць яе на работу ў Заходнюю Беларусь.

Якім бачыўся верасень 1939-га, выстаўка дакументамі з грыфам «Рассакрэчана», газетнымі палосамі ды вершамі Максіма Танка, Янкі Купалы і Пятруся Броўкі будзе расказваць да 7 лістапада.

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

Сітуацыя

# ЦІ АДНОВЯЦЬ СІНАГОГУ?

**У Віцебску на міжнароднай канферэнцыі прадстаўнікі Беларусі і замежныя даследчыкі абмяркоўвалі тэму захавання іўдзейскіх рэлігійных будынкаў. У цэнтры ўвагі былі рэшткі Вялікай Любавіцкай сінагогі, якая знаходзіцца недалёка ад дома-музея Марка Шагала. Будынак уяўляе вялікі інтарэс. Мяркуецца, што туды прыходзіла маліцца сям'я славутага на ўвесь свет мастака.**



Цагляная сінагога была пабудавана на месцы драўлянай у 1904-м. У 1980-я гады там быў склад для патрэб вытворчага прадпрыемства. І ўжо доўгі час, на жаль, з-за адсутнасці догляду яна разбураецца...

Канферэнцыю зладзілі Беларускі камітэт ICOMOS — грамадскай арганізацыі, якая вывучае спадчыну, спрыяе яе захаванню, аднаўленню, — і музей Марка Шагала ў Віцебску. Апошні быў задзейнічаны ў праекце па распрацоўцы канцэпцый аднаўлення будынкаў былых сінагог з арыентацыяй на інтарэсы мясцовай супольнасці.

У мерапрыемстве бралі ўдзел гісторыкі, краязнаўцы, музейныя работнікі, вернікі, кіраўнікі іўдзейскіх абшчын з Беларусі, Польшчы, Латвіі, Ізраіля.

**Галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Дзяніс ЮРЧАК** адзначыў, што цікавасць грамадскасці да спадчыны павялічваецца, а дзякуючы энтузіястам робіцца рэальныя справы. У прыватнасці, валанцёры добраўпарадкавалі яўрэйскія магілкі ў Бешанковічах — адны з найстарэйшых і найвялікшых у рэспубліцы.

Шмат зроблена ў аграгарадку Лужкі Шаркаўшчынскага раёна, каб захаваць памяць пра стваральніка дзяржаўнай мовы Ізраіля Элізэра Бэн-Ягуду. Дзякуючы прадстаўнікам грамадскасці статус гісторыка-культурнай каштоўнасці надалі былой лужкоўскай сінагозе, пабудаванай у сярэдзіне пазамінулага стагоддзя. Там у хедары (пачатковая рэлігійная школа), які дзейнічаў пры храме, вучыўся будучы славуты сын яўрэйскага народа. Цяпер на яго малую радзіму штогод прыязджаюць сотні людзей з розных краін.



**Намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Віктар ГЛУШЫН** падкрэсліў, што энтузіясты з часам могуць дабіцца многага: у свой час яны паспрыялі адкрыццю шагалаўскага музея, а летась адчыніўся музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча.

У Вялікай Любавіцкай сінагозе добраахвотнікі правялі суботнік. Віцэ-мэр Віцебска выказаў надзею, што сцены хоць і не будуць выконваць першапачатковыя мэты, затое змогуць выкарыстоўвацца ў якасці «знакавага элемента» пры распрацоўцы турыстычнай інфраструктуры.

Дарэчы, і **галоўны рабін Іўдзейскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі Мардэхай РАЙХІНШТЭЙН** лічыць, што надаваць сінагогам другое жыццё толькі дзеля самога аднаўлення няма сэнсу. Ды і гэта патрабуе вялікіх выдаткаў пры рэстаўрацыі, тым больш — будаўніцтве, як і пры эксплуатацыі будынкаў. Галоўнае — паважаць памяць, расказваць моладзі пра мінулае.

Паводле інфармацыі Яўрэйскага ўніверсітэта ў Ерусаліме, у Беларусі на сёння каля 125 будынкаў — былых сінагог, рэлігійных школ. Прыблізна 60 з іх у разбураным стане.

**Дырэктар музея Марка Шагала ў Віцебску Ірына ВОРАНАВА** канстатавала, што турыстаў, якія гуляюць у наваколлях установы культуры, цікавяць рэшткі дарэвалюцыйнай забудовы. Між іншым, сінагогу на паперы некалькі гадоў таму ўжо «ўпісалі» ў канцэпцыю так званага Шагалаўскага квартала, праектам рэканструкцыі якога займаўся славуты беларускі архітэктар Леанід Левін.

У музеі былі б вельмі рады атрымаць будынак для стварэння культурна-асветніцкага філіяла, цэнтра талерантнасці, гісторыі віцебскага і беларускага яўрэйства. Там можна было б адвесці пакой, дзе вернікі маглі б памаліцца...

Пакуль жа неабходна неяк інфармаваць пра аб'ект, напрыклад, усталяваўшы таблічку з тэкстам і фота пра гісторыю сінагогі.

Удзельнікі канферэнцыі прыйшлі да высновы, што наогул трэба вызначыць адказных за тое, каб дарэвалюцыйны будынак далей не разбураўся.

Каля рэштак Вялікай Любавіцкай сінагогі самадзейныя артысты выканалі народныя яўрэйскія песні, разыгралі анекдатычную сцэнку з дарэвалюцыйнага жыцця. Мінакі спыняліся і шчыра дзякавалі апладысментамі...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**